Заўтра-„Чырвонай Зьмене“ 10 год

Сёньня „Чырвоная Зьмена“ дае справаздачу комсамоліі Менску

ПРОЛЕТАРЫ УСІХ КРАЁЎ, ЗЛУЧАЙЦЕСЯ!

ЧЫРВОНАЯ ЗЬМЕНА

№ 104 (1373) | СУБОТА, 9-га мая 1931 г.

ШТОДЗЁННАЯ ГАЗЭТА РАБОЧА-СЯЛЯНСКАЙ МОЛАДЗІ
Орган ЦК і Менгаркому ЛКСМБ
УМОВЫ ПАДПІСКІ:

1 месяц	30 кап.
3 месяцы	90 „
6 месяцаў	1 р. 80 „
1 год	3 р. 60 „

АДРАС РЭДАКЦЫІ: Менск, вул. Карла Маркса, 38
Тэлефоны: рэдактара—7-25, сэкратарыят—12-19.
АДРАС КАНТОРЫ: Комсамольская 25, тэлеф. № 908.
ГОД ВЫДАНЬНЯ X.

Кошт асобнага №—2 кап.

Пераможам адвечную бяскорміцу

Партыя і ўрад шырока разгарнулі работу па пашырэньні сеткі жывёлагадоўчых колгасаў і саўгасаў. Лік малочнага гурту сёлета ўжо даведзены на соцыялістычным сэктары БССР да 2225 тысяч і сьвіней—да 2925 тысяч галоў.

Вырашэньне жывёлагадоўчай праблемы цесна і непарыўна зьвязана з стварэньнем адпаведнай кармовай базы. Гістарычным бічом расійскай жывёлагадоўлі зьяўляецца бяскорміца. З-за адвечнай бяскорміцы мы маем гадовы ўдой каровы ў тры разы меншы чым у Даніі. Па-гэтай жа прычыне мы атрымліваем мяса ад буйнай рагатай жывёлы ў два разы менш, чым Аргентына.

У мінулым годзе, зямельныя, колгасныя і кооперацыйныя органы, а таксама навукова-дасьледчыя ўстановы не разгарнулі баявой работы.

Трэба адзначыць, што Наркомзем Колгасцэнтр і комсамольскія організацыі сёлета яшчэ не разгарнулі шырокай работы для пашырэньня карновай базы і сілосаваньня.

Сёлетняя весеньняя пасеўная кампанія павінна стварыць рашучы пералом. Трэба забясьпечыць для соцыялістычнай жывёлагадоўлі магутную кармовую базу. Для гэтага неабходна павялічыць пасеўплошчу пад кармовымі і сілоснымі культурамі, перакрыць вызначаную НКЗ плошчу ў 35 тысяч га, загатовіць ня менш 1 мільёна тон сілоснай масы.

Організуючы з комсамольцаў, колгасьнікаў і вясковага актыву ўдарныя брыгады па паасобных відах работ ў галене здабываньня корму (брыгады сілоснага будаўніцтва, сенауборку, палепшаньня сенажацяй, правядзеньня сяўбы, мобілізацыі кармовых рэсурсаў, сяўбы па выпасах і г. д.)—забясьпечым ударныя тэмпы работы па кормаздабываньню.

Прыцягнуць да актыўнай барацьбы за корм колгасныя, саўгасныя шматтыражкі і насьценгазэты, рабсялькораўскія брыгады і пасты селькораў і юнкораў-ударнікаў.

Комсамольская організацыя павінна паставіць цэнтральнай сваёй задачай барацьбу за жывёлагадоўлю, забясьпечыць яе кармом, выканаць і перавыканаць плян сяўбы кармовых і сілосных культур.

Павесьці самую рашучую барацьбу з праявамі права-опортуністычным настрояў, якія выражаюцца ў скарачэньні пасеўплошчы пад кармовымі культурамі.

Комсамол абавязан сваёй ўдарнай работай на фронце жывёлагадоўлі забясьпечыць пасьпяховае правядзеньне сяўбы кармовых культур і таксама па-ўдарнаму правесьці сана-уборачныя кампаніі.

Комсамол пад кіраўніцтвам партыі павінен стаць на чале паходу за корм, быць ўдарнай брыгадай кармовага перакопу і сваёй ўдарнай работай перамагчы адвечную бяскорміцу.

КРЫВАВЫЯ РАСПРАВЫ ФАШЫСТЫХ НАД ПРАЦОЎНЫМІ ПОЛЬШЧЫ, ЗАХОДНЯЙ БЕЛАРУСІ І УКРАІНЫ

Ружэйны і кулямётны агонь па ўдзельніках першамайскіх выступленьняў

ПОЛЬСКІЯ АФІЦЭРЫ МАЦУЮЦЬ ХАЎРУС З РУМЫНІЯЙ

Сьвінцом ахоўваюць „бясьпечнасьць“

Польскі фашысцкі і соцыял-фашысцкі друк запэўніваў буржуазію, што дзень 1-га мая „пройдзе спакойна“ і „нормальны парадак ня будзе парушаны“. Напярэдадні 1 мая шырокай хваляй пракаціліся па ўсёй Польшчы масавыя аблавы, вобыскі, арышты. Тысячы рэволюцыйных рабочых і сялян кінуты ў астрогі. У засьценках ахранкі катавалі, зьбівалі і зьдзекаваліся над вязьнямі капіталу, вязьнямі крывавай фашысцкай дыктатуры.

Аднак, ня гледзячы на дзікі разгул белага тэрору на провокацыйную работу соцыял-інтэрвэнтаў—ППС, бундаўцаў, беларускіх і украінскіх нацыянал-фашыстых—рабочая кляса і рэволюцыйныя бядняцка-серадняцкія масы сялянства, пад кіраўніцтвам свайго авангарду—компартыі Польшчы, актыўна рыхтаваліся да баявой рэволюцыйнай дэмонстрацыі.

Камітэт крывавай расправы

Для крывавай расправы з рэволюцыйнымі дэмонстрацыямі быў створан спэцыяльны „камітэт бясьпечнасьці“, мобілізавана ўся поліцыя, фашысцкія і соцыял-фашысцкія дружыньнікі. Уся гэта чорная зграя была ўзброена бранявікамі, газавымі бомбамі, кулямётамі і спэцыяльна заказанымі новымі гумовымі кіямі. Разам з тым былі прыняты меры каб ня даць магчымасьці компартыі распаўсюдзіць першамайскія адозвы. Для гэтай мэты былі мобілізаваны ўсе дворнікі, якія на працягу тыдню павінны былі аберагаць дамы і муры, каб на іх ня былі расклеены комуністычныя адозвы і не напісаны рэволюцыйныя лёзунгі.

Аднак, ня гледзячы на ўсе высілкі фашысцкай зграі, рэволюцыйныя баявыя дэмонстрацыі пролетарыяту адбыліся бадай ва ўсіх прамысловых цэнтрах і ў радзе вёсак.

Так, у Варшаве пад кіраўніцтвам компартыі праведзена палітычная забастоўка. Пад сьцягам компартыі вышла на баявую рэволюцыйную дэмонстрацыі звыш 10.000 чалавек. Паліцыя і соцыял-фашысцкія дружыньнікі стралялі па радох пролетарскай дэмонстрацыі, ёсьць забітыя і шмат параненых. Пролетары давалі дружны, рашучы адпор зграі фашыстых. Рабочыя сталёвымі радамі вялі ўпартую барацьбу і дэмонстрацыі працягваліся да ночы.

У Лодзі звыш 10.000 тысяч пролетарыяў дэмонстравала пад сьцягам компартыі. Поліцыя і соцыял-фашысцкія дружыньнікі ўвесь час правакавалі на крывавую сутычку, аднак пад цьвёрдым кіраўніцтвам компартыі, поліцыі і соцыял-фашыстым быў дадзены адпор.

У Дамброве пад сьцягам компартыі дэмонстравала звыш 15000 рабочых.

Саснавіцах у часе мітынгу поліцыя распачала страляніну; лік забітых покуль што невядомы. Шэсьць рабочых цяжка паранены і 30 лёгка.



У Чэлядзі, Гродзяцы і Пяскове рабочыя абвясьцілі палітычную забастоўку і вышлі на баявую дэмонстрацыю, прычым пад сьцягам компартыі дэмонстравала да 3000 чалавек. На спробы поліцыі разагнаць дэмонстрантаў, рабочыя адказалі градам каменьняў. Поліцыя распачала стральбу, ёсьць забітыя і цяжка параненыя.

Абстрэл дэмонстрацый з кулямётаў


Буйныя баявыя рэволюцыйныя дэмонстрацыі адбываліся ня толькі ў вялікіх гарадох і прамысловых цэнтрах, але і на вёсцы. Так у в. Макевічах (Ковельскі пав. Валынскага ваяводзтва) звыш 1000 сялян з чырвонымі сьцягамі, з рэволюцыйнымі сьпевамі, пад кіраўніцтвам компартыі наладзілі рэволюцыйную дэмонстрацыю. Вялікія атрады пешай і коннай поліцыі накінуліся на дэмонстрантаў і далі залп у натоўп. Забіта двое сялян, шмат цяжка параненых. Рэволюцыйнае сялянства абаранялася каменьнямі і кіямі. Поліцыя ўчыніла шматлікія арышты.

У в. Галабцах (таго-ж павету) пад сьцягам компартыі дэмонстравала 15000 рэволюцыйных сялян. Поліцыя распачала страляніну, шмат забітых і параненых, прычым паранена шмат жанчын і дзяцей.

У Любартове (Люблінскага ваяводзтва) пад сьцягам компартыі дэмонстравала звыш 2000 рэволюцыйных сялян.

Поліцыя зрабіла засаду і з кулямёта абстраляла дэмонстрантаў, у выніку 2 чалавекі забіта і шмат паранена. Рэволюцыйным сялянам удалося разброіць 4-х поліцэйскіх; адабраным ад поліцыі аружжам сяляне далі адпор, прычым паранілі 3-х поліцэйскіх. Такія кароткія весткі з паасобных раёнаў, як прайшоў 1 май у фашысцкай Польшчы. Крывавай дыктатуры Пілсудзкага ня ўдалося задушыць, не ўдалося сарваць рэволюцыйнага выступленьня пролетарыяту Польшчы. Пад сьцягам комуністычнай партыі сотні тысяч пролетарыяў дэмонстравалі сваю клясавую салідарнасьць, сваю магутнасьць, організаванасьць і гатоўнасьць весьці да перамогі барацьбу супроць фашысцкага ўраду тэрору, голаду, беспрацоўя і вайны, супроць соцыял і нацыянал-фашыстых—лёкаяў буржуазіі, за работу і хлеб, за Савецкую Польшчу, у абарону СССР.

Л. ГАК



На здымку: труба стэарынавай фабрыкі ў Гамбургу з комуністычным лёзунгам 1 Мая.

Фашысцкі суд за работай

ВАРШАВА 7. Акруговы суд у Лодзі прысудзіў да катаржнай турмы на тэрміны ад 3 да 6 год 9 рабочых, абвінавачных у комуністычнай дзейнасьці.

Замойскі акруговы суд (Люблінскае ваеводзтва), разгледзеўшы справу 17 членаў партыі „Сельроб адзінства“ па абвінавачаньньні іх у прыналежнасьці да комуністычнае партыі Заходняй Украіны, прысудзіў 5 падсудных да турэмнага зьняволеньня на тэрміны ад аднаго да 5 год.

Віленскі акруговы суд разгледзіў учора так званую справу цэнтральнай сэкцыі компартыі Заходняй Украіны. Усе падсудныя абвінавачваліся у організацыі нелегальнай перавозкі комуністычнай літаратуры, якое быццам-бы перавезена да 60000 экзэмпляраў. Усе падсудныя прысуджаны да зьняволеньня у катаржнай турме ад аднаго да 8 год.

Варшаўскія афіцэры—едуць на румынскія ваенныя ўрачыстасьці

ВАРШАВА 7 З Варшавы выехала ў Румынію дэлегацыя афіцэраў 4-х пяхотных палкоў на урачыстасьці зьвязаныя з стагодзьдзем існаваньня 4-х пяхотных палкоў румынскай арміі. Польскія афіцэры прабудуць у Румыніі да 12 мая. Друк паведамляючы аб візыце называе яго маніфэстацыяй румынскай дружбы.

Процэс над комуністычным поэтай

СТАМБУЛ, 7. Учора ў Стамбуле пачаўся слуханьнем процэс над комуністычным поэтай Назымам Хікметам, які абвінавачваецца ў пропагандзе. Заля суда перапоўнена маладымі пісьменьнікамі і поэтамі. Назім Хікмет заявіў на судзе, што ён комуністы і, што турэцкая канстытуцыя ня лічыць комунізм злачынствам. Прыгавор 10-га мая.

Шаблямі „кормяць“ беспрацоўных дэмонстрантаў

БЭРЛІН. 6.—У Ротэрдаме (Голяндыя) учора мелі месца хвалюючыя дэмонстрацыі беспрацоўных, сутычці з поліцыяй. Вялікія групы беспрацоўных спрабавалі ўварвацца на біржу. Поліцыя атакавала дэмонстрантаў шаблямі нагала, але сустрэла рэзкі адпор.

Тысячы беспрацоўных гарнякоў паміраюць з голаду

НЬЮ-ЁРК. 7. У вугальным раёне Харламп (Штат Кентукі) гарнякі атрымалі верх ва узброенай сутычцы з поліцыяй, якая адбылася 4-га мая і ў час якой было забіта 4 чалавекі. Сутычцы папярэджваў разгром рабочымі харчовых складаў, якія належаць вугальнай кампаніі. У Харламп прыбыла 300 салдат. У раёне тысячы беспрацоўных гарнякоў паміраюць з голаду.

Першамайскія арышты і зьбіеньні ў Баўгарыі

ВЕНА, 6. Па дадатковых паведамленьнях з Софіі Першага Мая ў Пловдзільле баставала 6 тысяч рабочых. Поліцыя арыштавала 1 тысячу забастоўшчыкаў. Сярод іх 6 прадстаўнікоў рабочай партыі органаў мясцовага самакіраўніцтва.

З баўгарскіх турэм аслабанена пасьля зьверскіх катаваньняў, больш 70 рабочых, большасьць з іх прышлося накіраваць у бальніцу. Сэкратар рэволюцыйных профсаюзаў Міхайлаў быў да паўсьмерці замучан у турме ахранкай, якая імкнулася вырваць у яго прызнаньне аб тым, кім былі выпушчаны распаўсюджаныя Першага Мая комуністычныя адозвы.

На штурм тарпяных нетраў

Замест тысячы--ноль

Пасьпяховае правядзеньне торпсэзону пастаўлена над пагрозу зрыву. Дырэктыва ЦК ЛКСМБ аб мобілізацыі тысячы комсамольцаў на торпзаводы ня выканана.

###Ператварэньне БССР у тарпяны Донбас—справа сёньнешняга дня. Кантрольную лічбу ЦК ЛКСМБ безадкладна выканаць

Прайшоў амаль месяц, як бюро ЦК ЛКСМБ вынесла пастанову аб мобілізацыі 1000 комсамольцаў на тарпяныя распрацоўкі.

У сваёй пастанове бюро ЦК адзначыла асаблівую важнасьць разьвіцьця тарпянай прамысловасьці ў БССР і прапанавала ўсім раённым організацыям у вызначаныя тэрміны выканаць разьвёрстку.

25 красавіка трэцяя частка мобілізаваных ужо павінна была працаваць на торпзаводах. Аднак, яшчэ па сёньня ніводзін з мобілізаваных комсамольцаў на торпзаводы не зьявіўся.

Такія бясчынныя адносіны да важнейшых дырэктыў ЦК комсамолу можна расклумачыць толькі тым, што кіраўнікі комсамольскіх організацый недаацэньваюць асаблівай важнасьці разьвіцьця тарпянай прамысловасьці ў БССР, ператварэньня Беларусі ў тарпяны Донбас.

Мы пытаемся ў Барысаўскага РК ЛКСМБ:—Чаму дагэтуль не мобілізавана 12 чал., чаму ў Магілеве не мобілізавана 13 чал., чаму ў Бабруйску не мобілізавана 42 чал., у Гомелі 52, у Лоеве—10, у Мазыры—19 і г.д.?

Тарпяны сэзон ужо пачаўся. У выкананьні разьвёрсткі па мобілізацыі ня можа быць ніякіх адтэрміновак, яна павінна быць поўнасьцю выканана.

Па тым на колькі тая альбо іншая комсамольская організацыя здолее выканаць разьвёрстку, мы будзем меркаваць, як кіраўніцтва гэтых організацый змагаецца за ажыцьцяўленьне лёзунгу: „ператворым Беларусь у тарпяны Донбас!“

Капыльская комсамолія--у баку

Ператварэньне Беларусі ў тарпяны Донбас залежыць у першую чаргу ад таго, наколькі комсамольская організацыя вольмецца практычна за ажыцьцяўленьне гэтай ідэі.

У Капыльскім раёне ёсьць наяўлічоная колькасьць торпу. Яшчэ ў 1926-27 годзе, калі торп апрацоўваўся ўручную, балотная плошча ў 5-6 га давала апал усім установам м. Капыля. А зараз райкомбінат адчувае вострую патрэбу ў апале.

Зараз ужо пачаўся тарпяны сэзон. Безадкладна, бальшавіцкімі тэмпамі трэба ўзяцца за гэтую справу, уключыць комсамольскую энэргію ў барацьбу за беларускі Донбас.

Колгасьнік.

Даць топкам фрэзэрны торп

Вырашэньне задачы аб удасканаленых спосабах здабычы торпу адначасова высоўвае пытаньне аб тым, каб прыстасаваць беларускія прадпрыемствы, якія спажываюць торп, да яго спальваньня.

Да гэтага часу не ўстаноўлена, якія прадпрыемствы будуць паліць фрэзэрны торп і ў якім разьмеры, тады як сёлета, згодна програмы Белторпу, павінна быць здабыта 192 тыс. тон фрэзэрнага торпу, альбо 28 проц. усёй програмы.

Выгаднасьць здабычы фрэзэрнага торпу супроць існуючых спосабаў відаць з такіх паказчыкаў: зьмяншаюцца ў 16 раз выдаткі на мэталь, скарачаецца ў тры разы плошча і зьніжаецца ў 2 з пал. разы сабекошт торпу.

Ужо ёсьць вопыт спажываньня торпу ў форме дамежкі ад 25-35 пр. да кускавога на Шатуры, Магесу і г. д.

Аднак, найбольш удасканаленым і праверанным спосабам спальваньня фрэзэрнага торпу зьяўляецца топка—млын Кірпічнікава, дзе торп спальваецца ў выглядзе пылавіднага апалу, пры вялікім коэфіцыэнце карыснага дзеяньня. У гэтай топцы ўдавалася спальваць торп нават пры 60 проц. вільгаці.

Зусім не вядуцца вопыты па спальваньню фрэзэрнага торпу па дробных устаноўках. Па БССР мы маем каля 90 проц. установак з лянкашырскімі катламі, са ступенчатымі топкамі. Апошнія надзвычайна добра працуюць на пілавіньні, чаму мы маем усе падставы меркаваць, што яны пасьпяхова будуць працаваць і па фрэзэрным торпе.

Энэргаддзел ВСНГБ павінен заразжа заняцца вопытамі над спальваньнем фрэзэрнага торпу ў лянкашырскіх катлах.

Рашэньне прамсэкцыі Дзяржпляну аб пастаноўцы падобных вопытаў на Эльводзе даюць поўную магчымасьць пачаць першыя досьледы ў БССР на спальваньню фрэзэрнага торпу. Неабходна фарсаваць гэту надзвычайна важную справу.

Белторп унёс прапанову скласьці ўрадавую тройку па фрэзэрнаму торпу Гэта у значнай ступені дапамагло-б форсаваць прасоўваньне фрэзэрнага торпу і рассеяла-б пасыўнасьць і закаранеласьць некаторых гаспадарчых організацый у гэтай справе. Таму мы лічым, што адзначаная прапанова павінна быць ажыцьцяўлена.

В. Ш.

Пляну яшчэ няма

Пачаўся тарпяны сэзон, а Белсампрамсаюз нават ня мае сталага пляну здабычы торпу ў гэтым годзе.

Асноўная праца Белсампрамсаюзу ў падрыхтоўцы да тарпянага сэзону выразілася ў тым, што ён прыняў ад Наркомзему буйныя таварыствы прамысловага характару. Аднак, і гэтая праца праходзіла без спэцыялістых.

Паміж Мэліотрэстам, Белсампрамсаюзам і Наркомземам няма цеснай сувязі, сродкі вытворчасьці не сконцэнтраваны, кожная з гэтых організацый працуе паасобку. Да якога-ж часу гэта будзе?

Брыгада „Ч. З.“ Тарлецкая, Каткоў.

Плыты павінны гнаць ударныя брыгады плытагонаў

На сплаве бяз перамен

Апошнія дні не далі пераломy ў стане лесасплаву. Клясавы вораг скарыстоўваў усе магчымасьці для зрыву вытворчых плянаў. Грамадзкія і комсамольскія організацыі не даюць організаванага адпору.

Пляны сплаву навінны быць выканаы. Хутчэй рэалізаваць вынаходзтва тав. Пякурына

Масавая праца на сплаве здана ў концэсію ворагу

Сплаў распачаўся. Комсамольскія і профсаюзныя організацыі злачынна бязьдзейнічаюць, не організоўваюць работу сярод плытагонаў.

Антысавецкай агітацыі кулака і падкулачніка не супроцьпастаўлена масавая выхаваўчая праца з рабочым лесасплаўшчыкам. Рвацкія настроі ў асяродзьдзі рабочых сплаўшчыкаў сталі звычайнаю зьявай.

З аднаго сплаўнага пункту тэлеграфуюць: на пункце 300 тысяч кубамэтрад сплаўнага дрэва, але сплаўшчыкі патрабуюць у рахунак зарплаты звыш вызначанага пайка 20 кілё мукі з кожнае лавы.

За зрыўку кары патрабуюць аплаты, якая значна правышае ўстаноўленыя расцэнкі. Вось характэрны выпадак. З-за высокага ўзроўню вады па сплаўнай рэчцы трэ' было тэрмінова зьняць мост, які затрымліваў дрэва і пагражаў сплаву. Група сплаўшчыкаў запрасіла за гэтую працу 70 рублёў, аднак яе выканалі ў шасьцёх за адзін дзень.

У гэтых умовах опортуністычна бязьдзейнічаюць комсамольскія, профсаюзныя і савецкія організацыі. Злачынна марудна праводзіцца мобілізацыя 500 комсамольцаў на сплаў па пастанове ЦК ЛКСМБ. Віцебская і Гомельская сплаў-канторы мобілізавалі пакуль адзінкі.

Профсаюзу, як організатара мас сплаўшчыкаў, не адчуваецца на справе. Сельсаветы ніякага практычнага ўдзелу ў сплаве ня прымаюць. Аб гэтым даволі яскрава сьведчаць факты бязьдзейнасьці раду сельсаветаў.

Вялікая неразьбярыха ў забясьпечаньні сплаўшчыкаў. Ня гледзячы на пастановы цэнтральных органаў аб тым, каб пэўны фонд продуктаў быў заброняваны для патрэб сплаву без папярэдняй аплаты іх кошту, коопэрацыйныя органы на мясцох патрабуюць поўнасьцю аплаціць гэты фонд, а ў іншым выпадку разбазарваюць продукты.

Плыты павінны гнаць ударныя брыгады плытагонаў. За гэта павінен змагацца комсамол, профсаюз і ўсе грамадзкія організацыі.

Ажыцьцявіць каштоўную вынаходку

Інструктар лесаплаву Лесбелу тав. Пякурын вынайшоў мэханічную прыладу для адгрузкі і разгрузкі дроў і іншага дробнага асортымэнту лесу.

Прылада ўяўляе сабой вельмі простую нескладаную конструкцыю. Ужываньне вынайдзенай мэханічнай пагрузкі і разгрузкі падвойвае продукцыйнасьць працы ў параўнаньні з ручною, прычым ёсьць магчымасьць павялічыць зарплату.

Усё гэта вельмі яскрава кажа аб вялікай каштоўнасьці для сплаву вынаходзтва тав. Пякурына.

Тав. Пякурын выяжджае ў Гомель для ажыцьцяўленьня сваёй вынаходкі.

Гомельскі гарком комсамолу павінен аказаць максымальную дапамогу вынаходцы тав. Пякурыну, каб правесьці ў жыцьцё мэханічную пагрузку і разгрузку дрэва.

Аб першых вынікаў свае працы тав. Пякурыну паведаміць рэдакцыю.

Р.

ЛЕНІНСКУЮ НАЦПОЛІТЫК[У]

ЎПАРТА АЖЫЦЬЦЯЎЛЯЦЬ

Выканаем пастановы X зьезду ЛКСМБ аб беларусізацыі

Бюро ЦК ЛКСМБ у сваёй пастанове аб вылазцы Чудзіна яскр[ава] адзначыла: „усім комсамольскім організацыям Беларусі ва ў[сю] шырыні абгаварыць пытаньне аб контррэволюцыйнай вылазцы [Чу]дзіна, зрабіўшы з гэтага адпаведныя палітычныя вывады, мобіл[із]аваўшы ўсю комсамольскую організацыю і шырокія колы рабоча[й] працоўнай моладзі на яшчэ больш рашучую і бязьлітасную бараць[бу] з вялікадзяржаўным шовінізмам, як галоўнай небясьпекай на дан[ым] этапе, беларускім контррэволюцыйным нацыянал-дэмократызма[м], шовінізмам розных колераў, яшчэ больш узмацніўшы тэмпы бе[ла]русізацыі, форсуючы ажыцьцяўленьне пастаноў зьезду комсамо[лу], кастрычнікаўскага і красавіцкага пленуму ЦК КП(б)Б у правядзе[ньні] ленінскай нацполітыкі“.

Шмат якія колектывы па-ударнаму рэагавалі і рэагуюць на гэтую п[ас]танову, але ёсьць колектывы (Гомель і інш.), якія да гэтага ч[а]су нічога не зрабілі, не скарысталі вылазку Чудзіна для барацьбы [за] бальшавіцкае аўладаньне белмовай.

Комсамольскім організацыям неабходна зараз-жа, па-ударна[му] правесьці ў жыцьцё пастанову ЛКСМБ аб мобілізацыі ўсёй комса[мо]ліі, рабочай і працоўнай моладзі на яшчэ больш бязьлітасную [ба]рацьбу з вялікадзяржаўным шовінізмам,—галоўнай небясьпекаі [і] шовінізмамі розных колераў.

НАМ З ЧУДЗІНЫМ НЕ ПА ДАРОЗЕ

Я, комсамолка, студэнтка Менскага Яўпэдтэхнікуму (у сучас[ны] момант знаходжуся на самастойнай пэдагогічнай практыцы ў Калінк[а]віцкай яўсямігодцы ў сувязі з прарывам на фронце ўсеагульна[га] навучаньня), прачытаўшы на старонках нашага юбіляра „Чырвон[ая] Зьмена“ (№ 90) пра агідную вылазку махровага вялікадзяржаўна[га] шовіністага, былога студэнта нашага тэхнікуму Чудзіна М. цалк[ам] далучаю свой голас глыбокага абурэньня да думкі ўсяго наша[га] колектыву тэхнікуму, які ў сваёй рэзолюцыі бязьлітасна асудз[іў] гэтае контр-рэволюцыйнае выступленьне. Я саромлюся тым, што на[ш] тэхнікум выхаваў і выпусьціў такога разьюшанага вялікадзяржаўна[га] шовіністага, які грае на руку беларускім нацдэмам і шовіністам ус[іх] колераў.

Я абяцаю: яшчэ з большым захапленьнем узяцца за вывучэнь[не] белмовы і выхоўваць дзяцей, якіх цяпер вучу (і буду вучыць) інтэрнацыянальным духу.

Мая група зьвязана з групай беларускай чыгуначнай школы і м[ы] праводзім штодзенную сумесную працу, не абмяжоўваючыся ўрачыст[ы]мі вечарамі (як гэта мае месца ў некаторых школах). Цяпер м[ы] заключылі дагавор на социялістычнаму спаборніцтву.

З комсам[ольскім] прывітаньнем Р. Шапіра
21/IV-31 г.
Калінкавічы Яўсямігодка
P. S. Павінна дадаць, што [illegible] прышлось пісаць у гэтым [illegible] так абураная гэтым [illegible] змагла знаць [illegible] гэта маленькая [illegible]

Гураганны агонь па падпявалах Чудзіна

У Гомельскім Дарожна-Будаўнічым тэхнікуме на комсамольскіх і студэнцкіх сходах шмат гаварылі аб неабходнасьці беларусізавацца. Шмат было пастаноў і рэзолюцый, але ўсе яны засталіся на паперы і вынікаў ажыцьцяўленьня беларусізацыі няма.

Частка комсамольцаў і студэнцтва не вывучае беларускую мову, уж вае расійскую мову. Большасьць выкладчыкаў выкладаюць свае дысцыпліны ў расійскай мове. Дысцыпліны: мэханіка, дарожная, масты, матэматыка і інш. усе яшчэ выкладаюцца на расійскай мове. Выкладчыкі гэтых дысцыплін ня ўжываюць ніякіх захадаў для таго, каб выкладаць іх у беларускай мове.

На першым курсе з пачатку навучальнага году выкладалася беларуская мова, а ў сучасны момант нямаведа [ча]чаго гэтая дысцыпліна зьнята, не ві[дно] кладаецца.

Калі ў апошні раз на сходзе студ[эн]таў першага курсу пачалі падлічва[ць], колькі студэнтаў і як ужываюць бе[л]мову, дык студэнт комсамолец Рудз[ь]ко кажа: „Гомельшчыну нядаўна да[лу]чылі да Беларусі і па магчымасьці вывучаем белмову, а не патрэбна сі[л]ком прымушаць“.

Патрэбна даць рашучы адпор „ко[м]самольцам“ тыпу Рудзько, які хава[ю]чыся за гэтую шыльду, становяц[ца] на шлях простай дапамогі шовіністы[м].

Адміністрацыі, комсамольскай ячэі[кі] і профкому неабходна зараз-ж[а] зьвярнуць увагу на ўпартае і настой[]лівае ажыцьцяўленьне беларусізацы[і].

Міхась Золкі

Абвясьцілі дэкаду штурму

У адказ контррэволюцыйнай вылазцы настаўніка Чудзіна, які сваім выступленьнем рабіў нахабную спробу атакаваць генэральную лінію партыі ў нацпытаньні, Віцебскімі рабфакамі: пэдагогічна-індустрыяльным, электротэхнічным, вэтэрынарным і рабфакам сувязі быў праведзены мітынг, на якім студэнты і выкладчыкі з вялізарным абурэньнем кваліфікавалі выступленьне Чудзіна як наглае контррэволюцыйнае, якое льле ваду н[а] млын беларускіх нацыянал-фашыстаў і шовіністых усіх колераў нацыянал-фашыстаў з Зах-Беларусі Астроўскім, Луцкевічам і інш.

Данкоз.

Выкладчык сьпеваў сьпявае гімны русацяпам

Ня гледзячы на зусім выразныя дырэктывы партыі і ўраду аб ажыцьцяўленьні ленінскай нацполітыкі, Мазырскі дзяржаўны пэдтэхнікум яшчэ і да гэтага часу не пераключыўся на ўпартае і настойлівае ажыцьцяўленьне беларусізацыі ў сваёй штодзённай рабоце.

Надзвычайна дрэнна абстаіць справа з выкладаньнем сьпеваў. Замест вывучэньня песьняў на беларускай мове, вывучаюцца расійскія сьпевы, якія павінны будуць ужывацца ў пачатковых школах (выкладчыкам так і разьлічана). Зусім зразумела, што правядзеньне такога русіфікатарства будзе пераносіцца ў ніжэйшыя школы. Патрэбна зараз-жа зьмяніць праграму сьпеваў у бок павялічэньня колькасьці беларускіх сьпеваў.

М. Калючы

ДАЦЬ ФАБРЫКАМ МЯСА КОМСАМОЛЬСКІЯ КАДРЫ

Опортуністыя, галавацяпы з Вульскага, Слуцкага, Мазырскага, Сьвіслацкага райкамолаў ігноруюць рашэньні партыі і ЦК ЛКСМБ

Мобілізацыя комсамолу ў лік „2000“ павінна быць выканана

Спыніць саботаж

Забясьпечыць выкананьне пастановы ЦК аб мобілізацыі „2000“ у саўгасы „Сьвінавод“

ЦК ЛКСМБ, у сваім рашэньні ад ...га сакавіка, пастанавіў правесьці ...працягу месяцу мобілізацыю двух ...сяч комсамольцаў у саўгасы „Сьві...вод“. Разьвёрстка трэ' было выка...ць у тэрміны: 1000 чалавек да 15-га ...савіка і 1000 чалавек да 25-га кра...віка.

...се тэрміны прайшлі. Пачалася вя...ьняя сяўба, пачаўся вясеньні апа... сьвінаматак. Аднак, ніводзін РК да ...ага часу ня выканаў разьвёрстку ...мобілізацыі.

Прыкладна, Сьвіслацкі райком ...СМБ павінен быў мобілізаваць для ...гасу Бацэвічы (Клічаўскі раён) 10 ...самольцаў. Саўгас іх чакае. А рай... піша ў ЦК „ ня можам мобіліза...ць комсамольцаў на іншыя работы ...узязі з малой організацыяй, гэта ...ражае памяншэньнем комсамольс... організацыі на 25 проц. і разва... колгасных ячэек, а таму просім ...яць“ і г. д.

...ьвіслацкі райком таксама зарумзаў, ...мсамольцы мобілізуюцца на розныя ...сы“.

...усім іншыя выбрыкі робіць Вульскі ...ікомол- Доўгі час ён упіраўся ня ха... даць 20 комсамольцаў для саўгасу ...анонь-Базьдзедавічы“, Ветрынскага ...ну. Калі-ж буксірная брыгада гэтага ...гасу завярбавала 18 комсамольцаў, ...к райком накіраваў толькі 7 комса...льцаў малалетак. А ў пастанове ...а гаворыцца: „мабілізаваныя па ...осту павінны быць ня менш 18 ...“.

...аўгасу „Вялень-Сінча“ павінны прыслаць мобілізаваных: Старобінскі, Жлобінскі, Пухавіцкі і Буда-Кашалеўскі райкамолы. Саўгасы для дапамогі райкомам прыслалі спэцыяльных людзей, але і гэта не дапамагло.

Жлобінскі райкамол ад мобілізацыі на адрэз адмовіўся, мотывуючы тым, што ў гэтым раёне мяркуецца організацыя сьвінаводчага саўгасу.

Буда-Кашалеўскі „згадзіўся“ мобілізаваць замест 15 чалавек толькі 10.

Старобінскі РК да прыезду прадстаўнікоў не пачынаў мобілізавацы, бо, бачыце, зусім запамятаваў аб пастанове ЦК.

Пухавіцкі РК задумаў выехаць на абяцанках. А ў саўгасы да гэтага часу з усіх раёнаў зьявіліся толькі 2 комсамольцы, якія яшчэ не прыступілі да працы.

Тое-ж самае і з пасылкай комсамольцаў у саўгас „Зара захаду“. З намечаных 80 чалавек, на работу зьявіліся толькі 12 мобілізаваных.

Ельскі РК прыслаў 10, замест 25. Парычанскі—2 замест 25. Заслаўскі РК—ніводнага.

Вузьдзенскі райкомол пастанавіў мобілізаваць комсамольцаў у саўгас „Кухцічы“, але пастанова так і засталася не рэалізаванай.

Віцебскі райгаркомол вынес свой „сустрэчны плян“. Замест 50 комсамольцаў па заданьню, пастанавіў мобілізаваць для саўгасу „Новыя зялёнкі“ толькі 30, але і тыя яшчэ ня прыбылі для работы.

На мясцох комсамольскія організацыі дапушчаюць скрыўленьні і іншага парадку.

Круглянскі райкомол пастанавіў мобілізаваць 25 комсамольцаў, але адначасова просіць ЦК даволіць скарыстаць мобілізаваных комсамольцаў на сталай працы ў свайм раёне. Аршанскі РК таксама не згаджаецца мобілізоўваць комсамольцаў для іншых раёнаў і пакінуў мобілізаваных у сваіх саўгасах.

Сакратар Любаньскага РК, тав. Макарэвіч, піша: „зьвяртаюся з апошняй просьбай да ЦК адмяніць пастанову аб мобілізацыі 10-ці комсамольцаў бо у нашым раёне таксама будуюцца саўгасы і патрэбна рабочая сіла. Я не разумею каго і куды мобілізоўваць: ці ў Грэскі раён, ці ў свой саўгас „Загальле“. Але тут-жа Макарэвіч сам сябе выкрывае:—„Я не разумею, па-другое,—піша ён,—чаму ЦК ня ўлічвае таго, што ў Любаньскай організацыі на сёньняшні дзень 250 комсамольцаў і 24 колгасы без комсамольскіх ячэек. Усё гэта ЦК на мойму павінен улічыць і адмяніць ранейшую пастанову аб мобілізацыі комсамольцаў у сьвінаводныя саўгасы“.

А чаму, тав. Макарэвіч, у вас толькі 250 комсамольцаў і колгасы без ячэек? Чаму ў Любаньскай організацыі і да гэтага часу няма належнага пералому ў выкананьні рашэньняў 9 зьезду УсеЛКСМ; чаму дырэктывы партыі і комсамолу аб вырашэньні мясной проблемы ня выкананы?

Райкомы павінны на аснове пастановы ЦК КП(б)Б і ЛКСМБ разгарнуць растлумачальную работу сярод комсамольскай організацыі і, на аснове індывідуальнага адбору, у самы кароткі час выканаць заданьне ЦК.

А. Усьмінскі.

Опортуністыя зрываюць мобілізацыю „2000“

Згодна пастановы сэкратарыяту ...ЛКСМБ у саўгас „Банен-Бязь...давічы“ павінна быць мобілізава... 100 чалавек комсамольцаў. ...трынскі райком павінен даць 25 ...лавек, Вульскі 20, Сіроцінскі 20 ...Полацкі 35 комсамольцаў. Саўгас ...лучыў спэцыяльнага чалавека ...я гэтай мобілізацыі, які зьвязаў... з усімі райкомамі, выяжджаючы ...райкомы і ячэйкі для тлума...ньня важнасьці гэтай работы.

...мясцох аказалася, што райкомы ...носяцца да мобілізацыі нядбайна. Сіроцінскі райкомол зусім адмо...ўся ад мобілізацыі. Полацкі раён ...слаў апеляцыю каб памяншалі ...лькасьць. Ветрынскі раён зусім ...я дзейнічае, а Вульскі райкомол ...білізаваў усяго 7 чалавек з 20 ...намечаных.

Лічым, што такія адносіны ...к да выкананьня дырэктыў ...К па комплектаваньню сьвінагадоўчых гаспадарак комсамольскімі ...драмі недапушчальны. Просім ЦК ...ЛКСМБ прыняць належныя меры ...на райкомы, каб ...яны выканалі заданьне ў тэрмін.

Дырэктар саўгасу— Туніцкі.

Сэкратар партколектыву— Грошаў.

Наладзіць падрыхтоўку кадраў для Сьвінаводу

ЦК ЛКСМБ і рэдакцыі „Чырвонай Зьмены“

Згодна пастановы Сьвінаводтрэсту, 15 красавіка павінен адчыніцца САЎГАСВУЧ, пры сьвінаводчым саўгасе „Лемніца“, на 40 асоб з далейшым пашырэньнем яго да 120 асоб.

Да гэтага часу, ня гледзячы на рад напамінкаў, Сьвінаводтрэст ня прыслаў програмы занятках і нават ня вызначыў загадчыка.

Такія адносіны Сьвінаводтрэсту ставяць пад пагрозу зрыву адчыненьне САЎГАСВУЧУ.

Просьба ЦК ЛКСМБ узьдзейнічаць на Сьвінаводтрэст, каб ён хутчэй адчыніў САЎГАСВУЧ, бо для гэтага саўгас мае адпаведныя ўмовы.

Сэкратар Кохаваўскага РК ЛКСМБ Элькінд.

Мазырскаму і Слуцкаму райкамолу за невыкананьне пастановы ЦК абвешчана вымова

(З пастановы Сэкратарыяту ЦК ЛКСМБ ад 25 красавіка 1931 году).

Ня гледзячы на катэгорычную пастанову ЦК ЛКСМБ аб мобілізацыі двух тысяч комсамольцаў у саўгасы „Сьвінавод“, да гэтага часу разьвёрстка ня выканана. Рад РК, як Сьвіслацкі, Дрысенскі, лічаць гэтую мобілізацыю немагчымай, а Слуцкі і Мазырскі нават адмовіліся выканаць пастанову.

Сэкратарыят ЦК разглядае невыкананьне дырэктыў партыі і ЦК ЛКСМБ як праяву правага ўхілу, як недаацэнку разьвіцьця сьвінагадоўлі, якая м е вялікае экономічнае і політычнае значэньне ў сэнсе хутчэйшага вырашэньня мясной проблемы, як об'ектыўнае адмаўленьне ад вырашэньня задач партыі ў гэтай галіне.

Выходзячы з гэтага, Сэкратарыят ЦК ЛКСМБ, пастанаўляе:

Абвясьціць вымову Мазырскаму і Слуцкаму РК ЛКСМБ за адмаўленьне ад выкананьня разьвёрсткі па мобілізацыі і прапануе ўсім РК ЛКСМБ забясьпечыць поўнае выкананьне заданьняў па мобілізацыі. ЦК папярэджвае, што ў выпадку невыкананьня гэтай пастановы ў вызначаны тэрмін, будуць прымацца меры як у адносінах да бюро РК, так і пэрсанальна да сэкратара райкамолу.

Саўгас „14 партызан“ чакае мобілізаваных комсамольцаў

ГРЭСК 7-У (Па тэлефону ад нашага юнкора) Мобілізацыя комсамольцаў у сьвінаводны саўгас імя 14 партызан зрываецца. Па пастанове ЦК ЛКСМБ у гэты саўгас на сталую працу павінны былі мобілізаваць: Грэскі райком 25 комсамольцаў, Асіпавіцкі РК—15, а Любанскі—10.

Грэскі райком, замест 25, мобілізаваў 8 комсамольцаў, Асіпавіцкі РК толькі аднаго, а Любанскі райкамол ніводнага.

Райкомы ЛКСМБ ўсе яшчэ опортуністычна недаацэньваюць важнасьці стварэньня сталага штату рабочых у новаарганізаваных сьвінаводных саўгасаў.

Ц. Макарэнка.

Дэзэртырам працоўнага фронту ня месца ў комсамоле

БАРЫСАЎ. (Па тэлефону ад нашага юнкора) Райком ЛКСМБ вынёс пастанову аб мобілізацыі 100 комсамольцаў на сталую працу у прыгарадны саўгас. Было мобілізавана каля 40 комсамольцаў. Зьявіўшыся у саўгас яны паўцякалі, засталіся працаваць 4 комсамольцы. Саўгасу не хапае рабочае сілы, што пагражае выкананьню пляну вясеньняй сяўбы.

Райком з ўсёй рашучасьцю павінен прыцягнуць да саюзнай адказнасьці комсамольцаў, якія дэзэртавалі з саўгасу. Саўгас павінен атрымаць 100 комсамольцаў мобілізаваных райкамолам.

Кугель.

КОМСАМОЛ, ТЫ-ШЭФ СІЛОСУ!

У бой за 500 тысяч га сілосных культур!



Кармовая проблема і жывёлагадоўля

Вырашыць кармовае пытаньне можна толькі на аснове організацыі буйных спэцыялізаваных саўгасаў і колгасаў. Адсюль, чым шпарчэй будзе тэмп колектывізацыі і організацыі саўгасаў, з адначасовым узмацненьнем існуючых саўгасаў і колгасаў, тым хутчэй будзе вырашана кармовая проблема.

Работа па вырашэньню кармовага пытаньня як і ўсе іншыя віды работ соцыялістычнага будаўніцтва, павінна праводзіцца мэтодам соцспаборніцтва і ўдарніцтва. Трэба мобілізаваць партыйную, комсамольскую, коопэрацыйную, адміністрацыйна-гаспадарчую, навукова-дасьледчую масы і ўсё грамадзтва на актыўны ўдзел у вырашэньні кармовага пытаньня.

Мобілізаваць саўгасна-колгасны актыў на жывёлаводча-кармовы фронт, на максымальнае выкарыстаньне мясцовых рэсурсаў, організацыю выпасаў для летняга ўтрыманьня жывёлы.

Мэханізаваць як мага больш вытворчыя процэсы па першаздабываньню і кармленьню, для пабудовы сапраўдных буйных соцыялістычных жывёлагадоўчых гаспадарак.

Для летняга ўтрыманьня малочнай рагатай жывёлы і асабліва сьвіней, неабходна організаваць штучныя выпасы з раньняй вясны да восені.

Пад раньнія выпасы могуць быць выкарыстаны для сьвіней: зімовае жыта, адно ці ў мешанцы з зімовай вікай, потым яравая віка з аўсом, ячмень, пасьля канюшына, люцэрна (у паўднёвай частцы) і інш. расьліны.

Для кароў, акрамя адзначаных выпасаў, трэба закладаць выпасы з рознымі травянымі мешанкамі як на мінэральных глебах, так і на забалочаных і балотах. правёўшы на іх наперад мэліорацыю.

Пры разьмеркаваньні культур і загатоўцы кармоў у сваёй гаспадарцы, трэба выходзіць з патрэбнае колькасьці корму для данага віду жывёлы і напрамку га пада кі. Напрыклад, кармы для заводзкіх матак сьвіней павінны мець прыблізна такі склад: бульбы 10—20 проц. караньплодаў 10—15 проц., сілосу 10 проц., сена матыльковых 10 проц., ячменю 15—20 проц., аўсу 15—20 проц., гароху 10—15 пр., ільняных жмыхаў 10—15 проц. і вотрубаў 10—15 проц.; а для адкорму на сала і мяса: бульбы 50 проц. і больш, ячменю 30—40 проц., гароху 20—25 проц., аўсу 15—20 проц. і некаторых іншых; сілос і караньплоды амаль зусім не падыходзяць.

Адсюль, у залежнасьці ад напрамку сьвінагадоўлі, прыходзіцца выбіраць адпаведныя кармы і вызначаць іх колькасьць. Таму пры разьмеркаваньні культур, перад складаньнем пасеўнага пляну, трэба падлічыць, якой расьліны і колькі высяваць.

Для кармленьня буйнай рагатай малочнай жывёлы неабходна таксама падлічыць, якіх кармоў і колькі патрэбна для данай гаспадаркі, выходзячы з такога разьліку: кармавога рацыёну: сілосу 40—50 проц., караньплодаў і бульбы 20-30 проц., сена і саломы 20-25 проц. і моцных (як жмых, дзерць, вотрубы і інш.)—10 проц. ад усяго складу.

Як відаць, для малочных гаспадарак патрэбна зарыхтаваць па-больш сакавітых малакагонных кармоў, як сілос і караньплоды, потым патрэбна добра якаснае сена.


Неабходна зьвярнуць асаблівую ўвагу на разьвядзеньне сілосных культур (кукурузы, сланечніка) і караньплодаў (бурак, морква, бручка, турнэпс). Затым патрэбна пашырыць пасеў траў: канюшыны і розных мешанак. Шырока разгарнуць падсеў сэрадэлі пад азімыя і яравыя збожжавыя культуры.

Адначасова праводзіць паскораным тэмпам палепшаньне прырэзных выпасаў, сенажацяй і балот, якія зараз даюць вельмі мала карысьці, а захоўваюць у сябе вялікія багацьці, Такім чынам нагрузку на гэктар можна павялічыць у дзесяць разоў і болей.

Кармовая проблема мае шчыльную сувязь з экономным выкарыстаньнем корму, асабліва ў сучасны пэрыод. Мэханізацыя процэсаў па кормаздабываньню і кармленьню адыгрывае рашучую ролю; пры правільнай пастаноўцы мы можам організаваць буйныя жывёлагадоўчыя гаспадаркі на 15 тысяч сьвіней, на 10 тысяч буйнай рагатай жывёлы, з мінімальнымі затратамі рабочае сілы.

Адсюль становіцца ясным, што на вырашэньне кармовага пытаньня неабходна зьвярнуць асаблівую ўвагу ўсім гаспадарчым, коопэрацыйным, навукова-дасьледчым і грамадзкім організацыям сумесна з рабочымі саўгасаў і працоўнымі колгасаў. Пад кіраўніцтвам компартыі комсамол павінен мобілізаваць усе сілы і веды на палепшаньне мясцовых рэсурсаў для падвядзеньня кармовай базы пад соцыялістычную жывёлагадоўлю.

Г—і



Новыя сілосныя вежы.

Сустрэчным плянам дамо сілос жывёле

Бягомля. Комсамольская ячэйка колгасу „12-цігодзьдзе чырвонага Кастрычніка“ абгаварыла леташні вопыт сілосаваньня кармоў. Улічыўшы ўсе прамахі і недахопы ў сілосаваньні, ячэйка высунула сустрэчны плян: засілосаваць сіламі комсамольцаў і колгаснай моладзі 6. тон сілосу, замест 20 у мінулым годзе.

Ячэйка выклікае ўсе комсамольскія організацыі раёну пасьледваць прыкладу; своечасова абгаварыўшы гэта пытаньне, засеяць адпаведную плошчу сілоснымі культурамі.

Пост „Чырвонай Зьмены“ Бондар Хв.

Практыка паказала карысьць

Нядаўна ў колгасе „Чырвоная Полаччына“, Вушацкага раёну, была адчынена яма з сілосам, якую летась заклала комсамольская ячэйка. Атрымана 25 тон вельмі добрага сілосу, які жывёла спажывае з вялікай ахвотай.

М. Лемешаў.

КАДРЫ ВЫРАШАЮЦЬ ПЕРАМОГУ

Дамо лепшых ударнікаў-юнкораў-комсамольцаў на работу нізавога друку

Нізавы друк у перыод рэконструкцыі народнае гаспадаркі набывае асаблівае значэньне. Перад ім стаяць вялізарнейшыя задачы весьці рабочых у бой за выкананьне і перавыкананьне прамфінпляну, за рэконструкцыю заводу, за аўладаньне новай тэхнікай.

На вёсцы друк павінен стаць організатарам новых колгасаў, перадатчыкам вопыту лепшых узораў работы ў колгасе. Прыклад гэтаму падае газэта электростанцыі заводу імя Ланцуцкага. Яна павярнулася тварам да выкананьня конкрэтных задач, якія стаяць перад заводам. Але такіх газэт мала. Большасьць ячэек і колектываў не падыйшлі шчыльна да выкананьня пастаноў ЦК КП(б)Б аб умацненьні нізавога друку, аб разгортваньні рабселькораўскага руху (колектыў ЛКСМБ Менскага чыгуначнага вузла і інш.), што нельга інакш расцэньваць як ігнараваньне гэтых пастаноў.

Нобач з агульнымі гаспадарча-палітычнымі задачамі газэт, мы павінны з усёй упартасьцю дабівацца таго, каб насьценгазэты і наогул нізавы друк асьвятлялі спэцыфічныя маладзёжныя і комсамольскія пытаньні.

У прыватнасьці, падрыхтоўка да Ўсебеларускага рабселькораўскага зьезду і дню друку павінна быць праведзена пад кутом вылучэньня на работу ў нізавы друк вытрыманых, выпрабаваных у практычнай працы, юнкораў-ударнікаў-комсамольцаў. Асноўны наш лёзунг да дню друку і рабселькораўскага зьезду: ніводнай раённай, заводзкай і фабрычнай газэты без маладзёжнай старонкі; ніводнай цэхавай, саўгасна-колгаснай насьценгазэты бяз кутка моладзі; навокал кожнай старонкі і кутка павінны быць організаваны юнкоры-ўдарнікі!

У дзень друку абвяшчаю сябе ўдарнікам

Я юнкор газэты „Чырвоная Зьмена" прымаю выклік юнкора Алексяёнка і бяру на сябе, акрамя гэтага наступныя абавязкі.

У дзень сьвята пролетарскага друку абвяшчаю сябе ўдарнікам па распаўсюджваньню „ЧЗ". Абавязваюся завербаваць ня менш 50 падпішчыкаў, правесьці перавыбары рэдколегіі насьценгазэты ў колгасе імя 16 партызан, наладзіць выпуск насьценгазэты ў Дукорскай хатэ-чытальні.

У час вясновае сяўбы праз друк буду асьвятляць ход сяўбы і па ўдарнаму дапамагаць мясцовым організацыям у практычнай працы.

Выклікаю наследваць майму прыкладу юнкораў: Піскуна Міхася Піскуна Язэпа і Зяноўчыка (Сьмілаўскі раён)

Цімох Лявіцкі.

Забыліся пра колектывізацыю

Насьценгазэта ў колгасе „Кастрычнікавая рэволюцыя" (Заслаўскі раён) ні слова ня піша пра балючыя пытаньні, якія хвалююць зараз колгасную масу. Аб колектывізацыі вёскі, аб падрыхтоўцы колгасу да сяўбы і цэлы рад іншых пытаньняў газэта на сваіх старонках не асьвятляла. Таксама не згуртавала вакол сябе бядняцка-серадняцкую масу і не мобілізавала яе на барацьбу з кулаком.

Наогул трэба адзначыць, што ў Заслаўскім раёне працай насьценгазэт і разгортваньнем рабселькораўскага руху ў раёне ніхто не цікавіцца.

Вось чаму нашы насьценгазэты адстаюць ад жыцьця.

Грызун.

Бяспрытульная насьценгазэта

У вагонным цэху заводу імя Ланцуцкага (Гомель) ужо 5 месяцаў ня выходзіць насьценгазэта. Рэдколегіі няма.

Партыйна-комсамольскія і профэсыйныя організацыі глядзяць на гэта скрозь пальцы. Насьценгазэта знаходзіцца на правах бяспрытульнай, бо ёю ніхто ня кіруе.

Такое становішча надалей немагчыма. Комсамольская ячэйка вагоннага цэху павінна зараз-жа ўдзяліць максымум увагі насьценгазэце, наладзіць рэгулярны выхад яе і ўключыць яе ў агульна-гарадзкі конкурс на лепшую насьценгазэту, які праводзіцца на нашым заводзе.

Юнкор М. С.

Апраўдаць пачэснае званьне „Ударнік"

Ільлічоўка „Ударнік" пры Клімавіцкай аб'яднанай профтэхшколе сьпіць непрабудным сном, ужо больш двух месяцаў не мяняе матар'ялу. Разгортваньнем самакрытыкі насьценгазэта не займалася і не старалася стварыць вакол сабе юнкораўскі актыў.

Газэта не мобілізуе вакол сябе вучнёўскую масу на выкананьне задач вясеньняй пасеўнай кампаніі.

Ці ні час ужо газэце прачнуцца і даць сапраўдныя бальшавіцкія тэмпы працы, каб апраўдаць сваё пачэснае званьне „Ударніка"?

Братва

Насьценгазэта павярнулася тварам да вытворчага жыцьця

Насьценгазэта электростанцыі пры заводзе імя Ланцуцкага (Гомель) з ускладзенымі на яе задачамі поўнасьцю спраўляецца. Зьмешчаны матар'ял па-бальшавіцку ўскрывае ўсе недахопы і прарывы электростанцыі, востра бічуе гультаёў, прагульшчыкаў, лятуноў, выкрывае конкрэтных носьбітаў зла. У заметцы „Аб экономіі вугалю," конкрэтна ўказана, якім шляхам зьменшыць перажог вугалю і выканаць загад партыі і ўраду аб экономіі апалу.

Зараз насьценгазэта электростанцыі ўключана ў конкурс, які праводзіцца на заводзе парткалектывам і шматтыражкаю „Шлях соцыялізму" на лепшую газэту заводу.

Да недахопаў газэты трэба аднесьці тое, што яна не стварае вакол сябе рабкораўскага актыву. Газэта мае толькі 16 рабкораў. Рэдколегія поўнасьцю не працуе, з-за гэтага часамі спазьняецца выхад насьценгазэты.

Юнкор М.—С.

Мая прапанова

У месячнік друку, які пачынаецца з 20-га мая, і ў зьвязку з падрыхтоўкай да Ўсебеларускага зьезду рабселькораў, юнкоры павінны яшчэ з большай энэргіяй узяцца за распаўсюджваньне сваёй юнацкай газэты „Чырвоная Зьмена". Каб юнкоры больш актыўна ўзяліся за распаўсюджваньне сваёй газэты, я прапаную, каб рэдакцыя газэты „Чырвоная Зьмена" абвясьціла конкурс на лепшага юнкоравярбоўшчыка „ЧЗ", даўшы ў якасьці прэміі месца на Ўсебеларускі зьезд рабселькораў.

Клімянок.

Аб артыкуле „Пытаньні колектывізацыі ў БССР",

які зьмешчаны ў часопісе „Соцыялістычная рэконструкцыя сельскай гаспадаркі" за 1931 г.

Пастанова Бюро ЦК КП(б)Б ад 6-га красавіка 1931 г.

1. Абмеркаваўшы артыкул тав. Ганіна „Пытаньні колектывізацыі ў БССР" (часопіс „Соцыялістычная рэконструкцыя сельскай гаспадаркі" № 1-67 за 1931 г.), Бюро ЦК КП(б)Б констатуе, што ў гэтым артыкуле тав. Ганін высоўвае рад няправільных палажэньняў:

а) што былцам партыйнае і савецкае кіраўніцтва недастаткова змагалася з прышчэпаўшчынай і ня выкрыла своечасова прышчэпаўшчыну;

б) што былцам і да гэтага часу партыйнае і савецкае кіраўніцтва не забясьпечыла неабходнай рашучай перабудовы работы НКЗему і Дзяржпляну БССР, не дало адпаведнага напрамку ў рабоце тэорэтычнай аграрна-марксысцкай мысьлі і г. д.;

в) выходзячы з гэтага няправільнага пункту погляду—адсутнасьці былцам-бы выстарчальнай і пасьлядоўнай барацьбы з боку ЦК КП(б)Б з прышчэпаўшчынай,—тав. Ганін высоўвае супроць тав. Галадзеда паклёпніцкае і ілжывае абвінавачваньне ў тым, што былцам тав. Галадзед салідарызаваўся з Прышчэпавым, „не заўважыўшы кулацкай тактыкі наркома Земляробства Прышчэпава".

2. У адказ на артыкул тав. Ганіна, які Бюро ЦК КП(б)Б расцэньвае як „левацкі" наскок на палітычна правільную і пасьлядоўную лінію Цэнтральнага Камітэту КП(б)Б, Бюро ЦК КП(б)Б адзначае:

а) Уся КП(б)Б пад кіраўніцтвам і на чале з ЦК КП(б)Б пасьлядоўна і настойліва вяла і вядзе барацьбу за генэральную лінію партыі, супроць скажэньняў партыйнай лініі, асабліва за вастрэйшую барацьбу супроць аднаго з найболей небясьпечных скажэньняў—кулацкай лініі Прышчэпава.

б) У выніку гэтай барацьбы кіруючыя савецкія органы БССР—НКЗем Дзяржплян і рад іншых установ—рашуча і пасьлядоўна ачышчаны і ачышчаюцца ад клясава-варожых і чужых элемэнтаў з кулацкай палітыкай Прышчэпава і лінія гэтых органаў на працягу ўсяго апошняга пэрыяду цалкам і поўнасьцю адпавядае генэральнай лініі партыі.

в) У выніку клясавай пільнасьці ўсёй КП(б)Б і шырокіх працоўных мас адсягнуты ня толькі выкрыцьцё прышчэпаўшчыны, але і забясьпечана пасьпяховае разгортваньне работы па соцыялістычнай рэконструкцыі сельскай гаспадаркі і практычная работа па ... каму будаўніцтву савецкай ...

г) Тормазам у барацьбе КП(б)Б генэральную лінію партыі ... элемэнты ў партыйнай арганіз... часткі якіх раней займала ў БССР кіруючых пасад.

д) Тав. Галадзед, уваходзячы ў с... партыйнага кіраўніцтва і займаючы кіруючую савецкую пасаду (старшы... СНК БССР), увесь пэрыяд сва... тыўным кіраўніцтвам за праведзен... ў жыцьцё генэральнай лініі парт... з усімі яе скажэньнямі, у тым л... супроць прышчэпаўшчыны.

е) Бюро ЦК КП(б)Б адзначае, ... прамова тав. Галадзеда на Усебе... 5-II 1928 г. была палітычна правільн... і адпавядала пастановам XV зьезд... УсеКП(б).

Бюро ЦК КП(б) лічыць ... лены, што тав. Ганін у сваім ар... кул прывёў у скажоным выгляд... адарваную ад усяго зьместу, цыт... з прамовы тав. Галадзеда на нара... зямельных работнікаў у 1928 годзе.

Аб раённым і нізавым друку на мовах нацменшасьцяй

Пастанова сэкратарыяту ЦК КП(б)Б

1. Для больш сыстэматычнага абслугоўваньня працоўных мас нацыянальных меншасьцей БССР і яшчэ большага непасрэднага прыцягненьня іх да ўдзелу ў соцыялістычным будаўніцтве, лічыць неабходным:

а) У бліжэйшыя два месяцы організаваць сталыя старонкі на польскай мове ў наступных гарадзкіх і раённых газэтах: „Віцебскі Пролетары" (раз у дэкаду), „Ударнік Койданаўшчыны", „Бальшавік Барысаўшчыны" (раз у пяцідзёнку); на яўрэйскай мове: „Палеская праўда" (Гомель), „Віцебскі пролетары" (раз у пяцідзёнку);

б) На працягу 1931 г. забясьпечыць выданьне раз у пяцідзёнку старонак на польскай мове—у плешчаніцкай, капыльскай, лепельскай і шклоўскай раённых газэтах; на яўрэйскай мове—у дубровенскай, магілеўскай, полацкай і сеньненскай раённых газэтах.

в) Забясьпечыць выданьне ў колгасе імя Дзяржынскага (Буда-Кашалёўскі раён) шклографічнай шматтыражкі на польскай мове; у колгасах „Соцвэг" (Парыцкі раён), імя дзесяцігодзьдзя БССР —шклографічных шматтыражак на яўрэйскай мове, у колгасе „Бязбожнік" (Лёзьненскі раён) шклографічнай шматтыражкі на латыскай мове.

г) Забясьпечыць выданьне ў расьвянскай раённай шклографічнай газэце старонкі на літоўскай мове (для абслугоўваньня Малькаўскага, Лістоўскага с-с і калёніі „Софійка") і ў нараўлянскай раённай шклографічнай газэце—старонкі на нямецкай мове (для абслугоўваньня нямецкіх с-с Нараўлянскага і Каралінскага раёну);

д) Тав. Сянчука абавязаць у дэкадны тэрмін правесьці мобілізацыю ў друкарнях БССР унураных рэсурсаў шрыфтоў на мовах нацменшасьцяй і правесьці іх адпаведнае пераразьмеркаваньне ў адпаведнасьці з гэтай пастановай.

Зьвярнуцца ў Культпроп ЦК УсеКП(б), аб пазачарговым водпуску адпаведнай колькасьці шрыфтоў на мовах нацменшасьцяй.

Даручыць аддзелу Кадраў ЦК падшукаць кандыдатуру для вядзеньня старонкі ў раённай газэце на нямецкай мове.

2. Для падрыхтоўкі кадраў газэтных работнікаў на мовах нацменшасьцяў, абавязаць Комвуз ім. Леніна організаваць польскую і яўрэйскую групы на газэтным аддзяленьні.

Узьняць пытаньне перад УсеКП(б) аб організацыі падрыхтоўкі газэтных кадраў на мовах нацменшасьцяй (польскай, яўрэйскай і г. пры Комуністычным Унівэрсытэце Нацыянальных меншасьцяй Захаду ў Маскве.

3, ЦК КП(б)Б ставіць на від рэдактару газэты „Палеская Праўда" невыкананьне дырэктывы Культпропа ЦК аб рэгулярным выданьні ў газэце старонкі на яўрэйскай мове.

4. Абавязаць рэдактараў газэт „О...ка", „Акцябр", і Раўдонасіе Аўтоя... забясьпечыць сталую дапамогу гарадзкім і раённым газэтам у выданьні старонак на мовах нацыянальных меншасьцяй.

5. Культпропу ЦК разам з фракцыяй ЦСПСБ забясьпечыць выданьне на тых прадпрыемствах, дзе працуюць замежныя рабочыя—старонак, альбо куткоў на мовах гэтых замежных рабочых.

6. Пастанову апублікаваць у друку.

Увазе ЦКК—РСІ

ТАВАРЫШЫ ШЫРАЙ І ЭЛІНСОН

павінны і будуць працаваць разам з намі

Таварышы Шырай і Элінсон на працягу пяці год выхоўваліся ў Бабруйскай школе сьляпых. Два месяцы таму назад яны скончылі школу і, атрымаўшы поўную кваліфікацыю шчотачнай вытворчасьці, былі накіраваны ў Менск, па колькі там, у раёне работы школы, няма прадпрыемстваў шчотачнай вытворчасьці. Здавалася-б, што тут у Менску, дзе ёсьць прадпрыемствы шчотачнай вытворчасьці і дзе адчуваецца вострая патрэба ў кваліфікаваных кадрах, гэтым таварышом, маючым поўную кваліфікацыю павінны былі быць прадстаўлены ўсе магчымасьці для іх плённай працы на карысьць соцыялістычнага будаўніцтва.

Аднак, гэтых выхаванцаў школы сьляпых сустрэлі ў Менску надзвычайна абураюча. Таварышом Шыраю і Элінсону не адмовілі ў прыняцьці іх на працу ў Менскую шчотачную арцель сьляпых, але надзвычайна бюрократычна падыйшлі да пытаньня прадстаўленьня ім умоў для жыцьця і працы, адмовілі ў прадастаўленьні ім памяшканьня.

Таварышы Шырай і Элінсон не трацілі надзеі на атрыманьне памяшканьня, на працягу доўгага часу абівалі парогі таварыства сьляпых, Наркамасьветы, Гарсавету...

Наркамасьветы зьвярнуўся з просьбай да Гарсавету даць памяшканьне для т. т. Шырая і Элінсона. Гарсавет даручыў вырашыць гэта пытаньне Гарсабесу. Апошні катэгорычна адмовіўся прадставіць таварышом кватэру ў інвалідным доме, ня гледзячы на тое, што там, паводле заявы Таварыства сьляпых, ёсьць два вольныя месцы. Завязалася пісьмовая валакіта. Гарсабес у сваёй адносіне за подпісам т. Спалінскага бестурботна заяўляе:

„... школа должна определять там-же, на месте своих бывших учеников—слепых, а именно в Красном Береге или Бобруйске, так как Мингорсобес имеет только пригородные районы, принадлежащие к ним сельсаветы, комитеты взаимопомощи".

Такі, нахабна бюрократычны адказ Гарсабесу, ня гледзячы на тое, што гэтай установе добра вядома аб немагчымасьці выкарыстаньня т. т. Шырая і Элінсона ў Бабруйску. Гэтай-жа ўстанове вядома таксама і тое, што Менская шчотачная арцель сьляпых мае патрэбу ў кадрах. І, паўтараем, ня гледзячы на гэта, Гарсабес не паклапаціўся зрабіць магчымае для сябе.

Старшыня Гарсавету тав. Валодзька таксама ня ўжыў энэргічных захадаў, каб урэгуляваць, нарэшце, пытаньне з памяшканьнем для выхаванцаў. Тав. Валодзька ў гутарцы з работнікам Наркамасьветы, інспэктарам дзіцячых дамоў тав. Новікам заявіў:

— „Калі арцель прыняла іх на працу, дык няхай дае кватэру, а калі няма, хай будуе дом..."

Тав. Шырай пасьля доўгіх пакутных скітаньняў наведаў НК РСІ. Інспэктар НК РСІ тав Стэфановіч—як ня прыкра!—таксама няўжыла патрэбных мер, каб спыніць нарэшце зьдзекі над выхаванцамі, каб урэгуляваць усю гэтую абураючую справу. Тав. Стэфановіч пасьля таго, як вядомы ёй былі значынны адносіны да сьляпых т. т. Шырая і Элінсона, піша ў Наркамасьветы:

„Прапануецца ўрэгуляваць пытаньне з пасылкай на працу скончыўшага школу сьляпых Шырая Кастуся. НК РСІ лічыць недапушчальным бюрократычны спосаб адсылкі з установы ў установу, тым больш у адносінах асобы сьляпой. Неабходна дагутарыцца з адпаведнымі ўстановамі і вырашаць гэтае пытаньне.

Інспэктар РСІ—Стэфановіч".

Так, адносіны да сьляпых т. т. Шырая і Элінсона недапушчальныя, бюрократычныя, ганебныя, але-ж гэтакія адносіны да ўсёй гэтай абураючай справы праявіў і сам інспэктар РСІ т. Стэфановіч, прапануючы „дагутарыцца з адпаведнымі ўстановамі і вырашаць гэтае пытаньне". Гэта, бязумоўна, бюрократычны, у меншай меры, нячулы падыход да справы.

Мы звярачваемся да ЦКК—РСІ з тым, каб у самым тэрміновым парадку высьвятліць факты бясчынных зьдзекаў над былымі выхаванцамі школы сьляпых т. т. Шырай і Элінсонам і прыцягнуць да суровай адказнасьці вінаватых у гэтай абураючай справе.

Мы ўпэўнены, што ў самыя бліжэйшыя дні, дзякуючы ўмяшацельству ў гэтую справу ЦКК—РСІ. т. т. Шырай і Элінсон будуць разам з намі працаваць на карысьць соцыялізму.

Міх. Вярскі.

Адказны рэдактар МІХ. ПЛАТАЎ.

Друкарня імя тав. Сталіна.

Галоўлітбел № 699